Просто хорошая газета
Отдушина
12+
ГАЗЕТА РЕКЛАМНАЯ ДЛЯ ДОСУГА
№19 (766) 8 мая 2019 года
Издатель УП «Газета Слонимская» Основана 18 октября 2002 года Выходит один раз в неделю

У мінулую нядзелю ў Мастоўскім раённым цэнтры культуры адбыўся сольны канцэрт народнага вакальнага ансамбля «Эцюд». Такім чынам калектыў адзначыў свой 20-гадовы творчы шлях.


Артысткі «Эцюду», што ў Мастах

«Эцюд» — нязменная любоў да сцэны і гледача

Усё пачыналася ў далёкія 90-я гады. Тады паўстаў песенны калектыў «Прынямонка». Склад яго быў напачатку змешаны. Папулярнасць прыйшла з выкананнем сучаснай эстраднай музыкі. У 1999 годзе калектыву было прысвоена званне народнага. Падчас намінацыі калектыву прапанавалі змяніць назву. Так ўзнік сучасны «Эцюд». У музыцы той тэрмін азначае «п`еса для развіцця выканаўчай тэхнікі».

Склад калектыву з гадамі мяняўся. Быў момант, калі ў ім удзельнічала 11 выканаўцаў. Цяпер у ансамблі сем кабет. Усе яны выкладчыкі Мастоўскай школы мастацтваў.

Нязменным кіраўніком калектыву з`яўляецца Галіна Цярэнцьева. Салісткамі выступаюць Іна Аскірка, Жанна Бакун, Ціна Вазняк, Марына Бяспалава, Ларыса Балаханава і Вольга Мартынюк.

У рэпертуары калектыву ёсць як класіка, так і сучасныя песні, у тым ліку і беларускія. З выступамі «Эцюд» аб`ездзіў усю Гродзенскую вобласць. Было шмат прыемных сустрэч з гледачамі. Па словах Галіны Аляксандраўны, запамінальным для іх быў выступ на «Свіслацкім кірмашы», калі кожную іх песню падпявалі гледачы.

Калектыў нязменна прымае ўдзел у «Губернатарскіх канцэртах». У 2013 годзе ансамбль заваяваў першае месца на Міжнародным фестывалі песні імя Ганны Герман. Падчас яго дзяўчаты выканалі кампазіцыі «Сумерки» і «Една хвіля» па-польску. Аўтар апошняй песні быў у складзе журы. Пасля гэтага калектыў запрасілі выступіць на гала-канцэрце ў канцэртнай зале «Мінск».

На юбілейным канцэрце прагучалі як кампазіцыі мінулага часу, так і спецыяльна падрыхтаваныя да той імпрэзы.

На гэтай вечарыне было сказана шмат цёплых слоў у адрас калектыву.

Віншаванні былі і музычныя. Выкладчык музычнай школы Барыс Плішань сыграў на скрыпцы. Не прамінуў засведчыць сваю павагу да калектыву гродзенскі спявак Андрэй Грыгор`еў. Была яшчэ большая нечаканка. На сцэну падняўся сын Галіны Аляксандраўны Яўген. Ён таксама музыкант, лідар знакамітай групы Teleport.

Калектыў «ГС» таксама жадае «Эцюду» творчых поспехаў у будучыні.

Язэп ПАЛУБЯТКА
ФОТА АЎТАРА


Мастаўчанкі з «Эцюду»

История о том, как один пенсионер спасает деревья от подростков


Эдуард Францевич Сушинский

Эдуарду Сушинскому — 81 год, семь из которых он живет в микрорайоне Альбертин. Этот энергичный мужчина каждый свой день начинает с того, что идет с веником в ближайший лес. Не подумайте ничего плохого, у Эдуарда Францевича все в порядке с психическим здоровьем, просто пенсионер ежедневно подметает облагороженную полянку для отдыха.

«Я очень люблю это место в лесу. Когда-то все сам здесь сделал, обтесал сваленное дерево, чтобы людям приятно было посидеть, подумать и зарядиться энергией природы, — рассказывает Эдуард Францевич. — Слонимчане, которые живут в нашем микрорайоне, с удовольствием приходят сюда отдыхать. И не всегда убирают за собой. Но это ничего, я могу за чужими убрать, просто порядок очень люблю».

Несколько недель назад местные подростки, как рассказывает Эдуард Сушинский, повадились ломать молодые липки. «Уже раз пятый пытаются навредить. С корнем не могут выдернуть, потому что ствол уже толстый, так наклоняют дерево до земли. У одной липки уже раскололся ствол! — сетует Эдуард Францевич. — Я поставил подпорки под эти надломленные деревья. Если я уберу эти бревна, то деревья упадут на землю».

Мужчина расстроен: «Это настоящий вандализм! По-другому не назовешь! Неужели нельзя нормально, по-человечески, относиться к природе?!»

В милицию пенсионер не обращался, хоть и не мешало бы научить подростков, как бережно относиться к окружающей среде. Если родители не смогли дать нормальное воспитание, то, возможно, штраф с круглой суммой поможет утихомирить нерадивых детей.

А пока добрый 81-летний Эдуард Францевич спешит в свой любимый лес, чтобы подставить плечо-полено сломанным липам. Возможно, они выживут. Пенсионер оптимистично смотрит на вещи: «Если больше ломать не будут, то липки будут жить!»

Ольга ШИНКЕВИЧ
ФОТО АВТОРА

ФУТБОЛ

«Слоним-2017» вновь проиграл

В 4-м туре первой лиги чемпионата Беларуси по футболу «Слоним-2017» вновь терпит поражение.


Борьба за мяч

5 мая наши футболисты сыграли на выезде с микашевичским «Гранитом».

Соперник слонимчан открыл счет во втором тайме — на 49-й минуте гол забил Дмитрий Гирса. В концовке матча на 79-й минуте вновь мяч оказывается в воротах слонимчан. Автором гола становится Иван Верас.

Футбольный поединок был окончен со счётом 2:0 в пользу «Гранита».

За четыре сыгранных матча в этом сезоне нашим футболистам ни разу не удалось поразить ворота соперника. С каждым матчем команда катится в низ турнирной таблицы.

Напомним, что первые две игры в этом сезоне слонимчане сыграли в сухую ничью. Свой третий поединок футболисты провели на домашнем поле, где и проиграли «Смолевичам» со счётом 3:0.

По итогу 4-го тура «Слоним-2017» опустился на 13-е место в турнирной таблице.

Следующий матч слонимские футболисты проведут на родном стадионе, где им предстоит сразиться с пинской «Волной».

Состав: Дмитрий Сай (вратарь), Марк Усович (защитник), Георгий Читанава (защитник), Владислав Борисенко (защитник), Вадим Спасюк (полузащитник), Евгений Чичев (полузащитник), Сергей Кучмель (полузащитник), Артур Тишко (полузащитник), Евгений Заборонько (защитник), Владислав Берг (защитник), Иван Кириченко (защитник).

Запасные: Андрей Чешун (вратарь), Евгений Баль (нападающий), Владимир Мисютин (защитник), Ренат Аширов (нападающий), Денис Воскобойный (полузащитник).

Кристина СОЛОДУХО
ФОТО АНГЕЛИНЫ КОВАЛЕЦ



ОПРЕДЕЛЕНЫ ПОБЕДИТЕЛИ КОНКУРСА «СЕЛФИ С ЛЮБИМЫМ ПИТОМЦЕМ»

Определены три победителя конкурса «Селфи с любимым питомцем».
На первом месте с 50 голосами оказалось фото Виктории Максименко.
На втором — (45 голосов) Елена Дячук.
На третьем — (41 голос) Кирилл Яговдик.
Поздравляем победителей! Ждем в редакции «ГС»: ул. Красноармейская, 41.
Спасибо всем, кто принимал участие в конкурсе!

Ольга ШИНКЕВИЧ


Фото Виктории Максименко


Фото Елены Дячук


Фото Кирилла Яговдика

Земля смеется цветами.
Ралф Уолдо Эмерсон

Двор семьи Хилько выдержан в английском стиле

Слонимчане Анна и Александр Хилько за долгие годы проживания по улице Красноармейской создали свой уникальный, практичный и при этом очень приятный вид пространства рядом с домом.


Цветущий ковер

Цветущая обриета, флоксы, доронникум восточный, фритиллярия мелеагрис и многие другие растения привлекают внимание прохожих. Яркая ковровая дорожка из цветущих растений гармонично переключается с зеленью кустарников.

Профессионалы ландшафтного дизайна называют стиль благоустройства семьи Хилько английским — максимально естественный, с обилием зелени и отсутствием симметрии.

«Моя жена очень любит цветы, да и в принципе все, что связано с огородом-садом, — рассказывает хозяин дома Александр Владимирович. — И делает она все от души, не претендуя на лавры ландшафтного дизайнера. Высаживает то, что считает нужным. Получается красиво».

Сейчас во дворе семьи Хилько очень красиво цветет аубреция — это вечнозеленый многолетний цветок, неприхотливый почвопокровник, который разрастается очень быстро. Он образует живое покрывало из множества небольших четырехлепестных соцветий. Вживую этот ковер смотрится очень эффектно.


Нежные колокольчики

Многоярусность — еще одна отличительная черта двора семьи Хилько. Из-за кустов первоцветов выглядывают ирисы, цикламены. Всему свое время цветения. Именно поэтому придомовая территория семьи Хилько благоухает чуть ли не круглый год.

«Каждый цветок отдает свое благоухание и дарит вам умиротворение», — говорит Анна Григорьевна.

Ольга ШИНКЕВИЧ

НА ТАКОЙ ШКОЛЬНОЙ ТЕРРИТОРИИ ХОЧЕТСЯ ЗАДЕРЖАТЬСЯ ПОДОЛЬШЕ

Территория средней школы №9 — образец вкуса и пример для подражания.

Ухоженные выстриженные кустарники и деревья смотрятся как скульптуры, старательно расставленные по двору. Сотрудники школы поддерживают формы растений, соблюдая все правила топиария (от латинского Topiary – «фигурная подрезка»).

С другой стороны школы высажена аллея из туй. Здесь приятно пройтись летним знойным днем. Ежегодно старшеклассники дополняют аллею новыми деревьями. В средней школе №9 это традиция — в память о себе высаживать растения.

Красивая дорожка из плитки — изюминка участка. Между мраморными элементами насыпан красный декоративный щебень. По такой тропинке с радостью бегут школьники в свою альма-матер.

Переменка — это еще один повод насладиться красотами школьного двора. Здесь можно не только побегать, но и постоять в тени раскидистой ивы, надышаться весенними запахами цветущей липы, пройтись по дорожкам вдоль хост, цветущих тюльпанов.

Ольга ШИНКЕВИЧ



С фантазией все отлично!



Тематическая клумба

Посмотрите, как красиво! Ждем фото вашего двора


Приз от нашего спонсора

Дорогие читатели! Присылайте нам фото своих красивых дворов любым удобным для вас способом: в социальных сетях на страницах «Газеты Слонимской» в ВК, «Одноклассниках», на электронную почту shinkilabelar@gmail.com, вайбер: 8-029-133-04-21. Все присланные фото будут участвовать в конкурсе на лучшее благоустройство территории, который состоится 15 мая. Спонсором нашего конкурса по благоустройству дворов является ИП Лайша Л.И.

Присылайте нам фотографии своего благоустройства! У Вас будет возможность выиграть приз от нашего спонсора!

15 мая спонсор конкурса выберет победителя.


Ольга ШИНКЕВИЧ


ВОЙДИ В ИСТОРИЮ СВОЕГО ГОРОДА

В жизни каждого человека случаются как радостные, так и горестные события. Ведь именно из них и складывается хроника нашей жизни, которая может быть интересна не только нам, но и нашим потомкам. Поэтому давайте вместе создавать историю нашего Слонима.

Если вы хотите, чтобы издание «Отдушина» написало о вашей свадьбе, рождении ребенка, известило о смерти ближнего и напечатало некролог под рубрикой "Войди в историю своего города", пишите нам -по адресу:
г. Слоним, ул. Красноармейская, 41, Тел.: 612-26-43, 2-90-00 (Тел/факс) .

МАЗовцы провели акцию в Слониме в честь Дня Победы


Слонимчанин Олег Оскерко



МАЗовцы сплавлялись на лодках по Щаре

7 мая группа МАЗовцев наведалась в Слоним. Туристы сплавлялись по реке Щаре на лодках. В числе путешественников был и наш земляк Олег Оскерко, который живет в Минске и работает на МАЗе. Олег охотно согласился рассказать об акции и себе.

— В нашей группе находится двадцать работников МАЗа. Все они родом из других регионов, только один я в группе из Слонима. Мы решили провести акцию в честь Дня Победы. Наш маршрут лежал из деревни Бытень, куда мы приехали позавчера. В этот населенный пункт мы приехали из Минска на заводском автобусе. Затем на девяти лодках сплавлялись в Слоним. Всего мы проплыли 50 километров.

Олег рассказал о том, что пятнадцать лет работает на МАЗе. После армии он демобилизовался и сразу уехал работать в Минск, так с тех пор и работает на легендарном заводе.

В его семье подрастает три сына: самому старшему семь лет и двойняшкам по пять лет. На заводе Олег работает мастером, начинал свой трудовой путь рабочим: работал сварщиком.

В Слониме у него живет мама, которую он навещает, приезжая на родину, а в агрогородке Жировичи живет сестра.

— Раньше я чаще в Слоним приезжал, а как женился, появилось больше забот, поэтому в родной город приезжаю редко, — подмечает в разговоре Олег.

В группе МАЗовцев были не только мужчины, но и девушки, одна из них поделилась своими впечатлениями о туристическом маршруте.

Ольга:

— Я на заводе работаю экономистом. Мне предложили принять участие в акции, и я согласилась, ведь это очень интересно.

— Не холодно, не страшно сплавляться по реке?

— Нет, не страшно и не холодно, вчера было холоднее. Мне все нравится, у меня прекрасные ощущения, тем более что в подобной акции я участвую впервые.

Поделился своим впечатлением и ведущий инженер-технолог Алексей:

— Сегодня отличный день. Сложнее было вчера: весь день шел дождь, но ничего, мы все дошли, живы, здоровы. Мы по реке прошли уже километров пятьдесят.

Ждите от нас новый автобус, который скоро выпустит МАЗ,



Ольга


Алексей

— бросил на прощание фразу Алексей.

В этот день группа туристов посетила синагогу, побывала в Спасо-Преображенском соборе и возложила цветы к памятнику погибшим воинам.

Анна ВОЛОДАЩУК
anna@gs.by
ФОТО АВТОРА


Группа туристов возложила цветы к памятнику погибшим воинам

Пазнай сябе на фота

Паважаныя чытачы! Пазнавайце на старых фотаздымках сябе, сваіх знаёмых і блізкіх і тэлефануйце нам: 8 (01562) 29-000, 8 (029) 133-04-21 у працоўныя дні з 9:30 да 17:30. Хто цікава распавядзе пра герояў фотаздымкаў — атрымае запрашальны квіток на дзве персоны на спектакль Слонімскага драмтэатра.



У цэху

Гераіні фотаздымка, надрукаванага ў мінулым нумары «Аддушыны» 1 траўня, пазналі сябе.

— Гэты здымак зроблены гадоў 30 назад у цэху па мастацкай вышыўцы дываноў Слонімскага быткамбіната, дзе я на той час працавала, — расказала аўтару гэтых радкоў жыхарка вёскі Пятралевічы-1 Ларыса Уладзіміраўна Карлінская (Быкава), якая на здымку трымае вышыты дыван.



Вышыць такія кветкі — трэба пастарацца

Другая гераіня здымка, Людміла Іванаўна Трус, патэлефанавала ў рэдакцыю і распавяла, што дываны яны ў той час вышывалі кветкамі па драпавай ці шарсцяной тканіне і іх вырабы тады карысталіся вялікім попытам у пакупнікоў.

Людміла Іванаўна таксама падзякавала рэдакцыі за тое, што публікацыяй гэтага здымка мы нагадалі ёй пра яе маладосць.

Ларыса Карлінская, Людміла Трус, як і тыя, хто адгукнуўся на публікацыю здымкаў раней, атрымаюць запрашальныя кветкі на бліжэйшы спектакль для дарослых, які пакажуць у Слонімскім драмтэатры.

Мікола КАНАНОВІЧ
ФОТА З АРХІВА «ГС»

НА ЖЫЦЦЁВЫХ СКРЫЖАВАННЯХ

У вагоне


МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

Пасажырскі цягнік Гродна — Мінск спыніўся на невялікай станцыі. Быў душны жнівеньскі вечар, і ці па гэтай прычыне, ці па якой іншай людзей у плацкартным вагоне не дабавілася.

Ля расчыненага акна сядзеў Ён і ўглядаўся ў цемру. Неўзабаве на вольнае месца, а яны тут былі ўсе вольныя, усунулася Яна з дзвюма вялікімі сумкамі ў руках і адной маленькай цераз плячо. Суседка была высокая і мажная.

«Як доменная печ, — падумаў Ён. — Ад такога суседства будзе яшчэ гарачэй».

Устаў з месца і хацеў зачыніць акно. Вецер рвануў на лысіне маскіровачную пасму сівых валасоў, і яна заматляхалася нібы сцяг капітуляцыі. Пачаў лэпаць па галаве, ловячы і ўладкоўваючы на месца непаслухмяную пасму. Акно засталося адчыненым, і скрозь яго сапацела гарачае паветра. Ён не зважаў, у Яго быў толькі адзін клопат: прыдаць галаве джэнтльменскі выгляд.

«Дурань, забыўся папырскаць пасму жончыным лакам. Заўсёды так раблю, а гэта забыўся...» — падумаў разгублена.

Яна ўладкавала сумкі ля ног і тайком назірала за Яго марнымі клопатамі, затаіўшы ўсмешку ў кутках поўных губ.

— У вас лак ёсць? — спытаў з выглядам чалавека, якога засталі за непрыстойным занятkам.

— Прычоску будзеце рабіць? То ці варта, бо ўжо ж позна...

Ён адкінуўся на спінку сядзення і ўтаропіўся на суседку. Вочы ў яе былі чорныя, як памытыя расой вішні, з доўгімі, ледзь не да броваў, вейкамі. Шчокі круглыя, румяныя.

«Колькі ж Ёй гадоў? Ну недзе да пяцідзесяці, пэўна, на дзесяць менш, чым мне. Каб не гэты канфуз з пасмаю, то можна было б пазнаёміцца, а так і слова мовіць сорамна. А які прыгожы на Ёй спартыўны касцюм! Пэўна, імпартны, хаця і ў нас ужо навучыліся рабіць. Бывае, не адрозніш».

І раптам, калі Яна нагнулася, каб нешта дастаць з сумкі, Ён са здзіўленнем убачыў, што спартыўныя штаны распораты па шве. Акурат на сцягне.

«Оо-о, будзеш цяпер насміхацца з маёй пасмы... Я таксама маю з чаго пасмяяцца».

Распорка невялікая, сантыметраў на пяць, але ж вельмі прыкметная. Ён міжволі зажмурыўся. Калі расплюшчыў вочы, Яна сядзела за столікам насупрацьі, дастаўшы з сумкі прадукты, наважылася вячэраць. Ноздры прыемна казытаў пах вяндліны, свежага гурка. Усё накладзена на вялікую лусту хлеба.

«Не дзіва, што ў Яе такія пышныя формы! Ёсць нібыта які касец. Скупярдзяйка! Магла б і мне прапанаваць што-небудзь, а так адна меле. А я дома забыўся ссабойку. Жонка сабрала, паклала на стол, а я забыўся. Заўтра з самай раніцы да начальства, а яно невядома калі адпусціць, так што, можа, толькі павячэраць і давядзецца. Раз такая скваплівая, то няхай сядзіць з распораным швом, не скажу. А мог бы, няхай зашыла б, а то як будзе ісці па калідоры, то і іншыя ўбачаць».

Яна ўплятала прысмакі за абедзве шчакі і час ад часу пазірала на Яго: «Вочы нейкія галодныя, усё адно як два дні не еў. Можа, пакарміць? Але з якой рацыі? Гэта мужчына павінен частаваць. Не, каб ужо надта спадабаўся, то можна было б, а так... Худы, са шчаціннем на твары, ды яшчэ гэта пасма, што павінна была замаскіраваць лысіну... І што за дурная мода? Усім жа відаць, што лысы, то падстрыжыся ты акуратна, зусім іншы выгляд будзеш мець. Усё маладзяцца гэтыя мужчыны, усё прыхарошваюцца. Бедныя... Мы хоць парык на галаву нацягнем, а ім толькі і застаецца, што пасмы ляпіць».

Да Мінска заставалася якая гадзіна язды, і спаць гэтыя пасажыры не збіраліся.

Нечакана зайшоў высокі элегантны мужчына ў белай сарочцы з кароткімі рукавамі і белых штанах.

— Пайшлі ў рэстаран пасядзім, — прапанаваў Ёй. — Там, можа, не так душна?

Гэта, па ўсім відаць, быў знаёмы спадарожніцы.

— Пайшлі, — згадзілася.

«Як жа Яна пойдзе з распораным швом?! — Ён ужо пашкадаваў, што не сказаў пра гэта раней. — А цяпер як скажаш? Ат, няхай, за гэта не аштрафуюць. Каб столькі і клопату... Не трэба было смяяцца з маёй пасмы».

Яна вярнулася, калі цягнік набліжаўся да сталіцы. Была адна. Ён павесіў на плячо дарожную сумку і накіраваўся да выхаду.

— А ў вас спартыўныя штаны на шве распораты, — шапнуў на самае вуха.

— Дзе?! — яе твар заліла чырвань.

— Там, — кіўнуў галавой.

— Вы ведалі і маўчалі?! — агледзела сябе і ўбачыла тое шво.

— А што? Я вам не муж, каб гаварыць пра такія рэчы. Распораты ды распораты.

— І я так хадзіла ў рэстаран?! Які жах!

— Дык не прагналі ж...

— Хам!

— Ну. Я з пасмай, што матляецца абы-як, а вы з падранымі штанамі. Мы квіты. Трэба было не насміхацца цішком. Я ж бачыў...

Канец душнай ночы Ён прасядзеў на вакзале, а калі гадзіннік паказаў восем, паехаў да рэспубліканскага начальства, якое пачынала работу ў дзевяць. Праз прыёмную з бялявай маладой сакратаркай зайшоў у начальніцкі кабінет і ледзь не папярхнуўся паветрам: за сталом сядзела Яна! Хораша прыбраная, з умелым макіяжам. Спачатку здзівілася не менш, чым Ён, а потым прыгожыя губы скалісяі ў саркастычную ўсмешку...

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

Афиша

Слонимский драмтеатр

12 мая, воскресенье
Спектакль для детей «Мымрёнок», начало в 12.00, цена 4 руб.

Программа на 9 Мая

11.00 Торжественный митинг у памятника погибшим воинам
11.30 Городской парк (выставка боевой техники, солдатская каша, работа фотозон, праздничная торговля, аттракционы и др.)
12.10-12.25 реконструкция боевых действий по освобождению Слонима
12.25-12.35 Показательные выступления разведбата
12.35-13.00 Играет духовой оркестр
13.00-20.00 Концерт с участием разных исполнителей
20.00-21.00 Концерт артистов белорусской эстрады Стэллы, дуэта Натальи и Андрея Язвинских
21.00-22.00 Концерт Саши Немо
22.00 Акция «Споем песню «День Победы» вместе»

Слонимский центр культуры и отдыха

12 мая, воскресенье
Пасхальный бал православной молодежи, начало в 18.00

Кинозал

8 мая, среда
12.00, 14.00 «Велотачки» 2D (Испания, 2018, 6+, мультфильм, 1 ч 30 мин)
16.00 «Солдатик» 2D (Россия, 2018, 6+, военный, 1 ч 26 мин)
17.30, 20.40 «Мстители. Финал» 3D (США, 2019, 12+, фэнтези, 3 ч 02 мин)

9 мая, четверг
12.00 «Война. Остаться человеком» 2D (Беларусь, 12+, военный, 1 ч 40 мин)
14.00 «Солдатик» 2D
15.30 «Велотачки» 2D
17.00, 21.50 «Отпетые мошенницы» 2D (США, 2019, 16+, комедия, 1 ч 34 мин)
18.40 «Мстители. Финал» 3D

10 мая, пятница
12.00, 14.00 «Велотачки» 2D
16.00, 18.00 «Отпетые мошенницы» 2D
20.00 «Мстители. Финал» 3D

11 мая, суббота
12.00, 14.00 «Велотачки» 2D
16.00, 21.10 «Отпетые мошенницы» 2D
18.00 «Мстители. Финал» 3D

12 мая, воскресенье
12.00, 14.00 «Велотачки» 2D
16.00, 21.10 «Отпетые мошенницы» 2D
18.00 «Мстители. Финал» 3D

За главного редактора Николай Николаевич Кононович

Учредитель **Виктор Владимирович ВОЛОДАЩУК**

Телефоны редакции: Velcom: 8-029-133-04-21 **факс:** 8 (01562) 2-90-00 звонить с 9.00 до **18.00** **Skype — gazslon**

Регистрационное удостоверение №65 от 05.03.2009 года выдано Министерством информации Республики Беларусь. Свидетельство о госрегистрации УП "Газета Слонимская" ЮКЛ № 001845, выданное Гродненским областным исполнительным комитетом от 03.04.2003 г.

Авторы опубликованных материалов отвечают лично за подбор и достоверность фактов, их точка зрения может не совпадать с мнением редакции. Редакция не ведет переписки с читателями и оставляет за собой право не рецензировать и не возвращать рукописи. Редакция не несёт ответственности за содержание рекламы.

Тираж номера 3010 экз.

Время подписания к печати по графику 7 мая 2019 года 17:00

Объем — два условных печатных листа. Газета отпечатана в ГОУПП "Гродненская типография", Гродно, ул. Полиграфистов, 4. индекс 230025 ЛП №02330/39 от 27.03.2014 Заказ № 2127

ISSN 1991-3362



ГАЗЕТА ВЫХОДИТ НА РУССКОМ И БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКАХ

Для корреспонденции: 231799, г. Слоним, ул. Красноармейская, д.41 Юридический адрес: г. Слоним, ул. Красноармейская, 41

Свободная цена

РЕКЛАМНАЯ СЛУЖБА 8(044) 715-90-03 8(044) 762-48-39; 8(044) 715-90-03 ул. Красноармейская, 41 **e-mail:** gs@gs.by, gazslon@gmail.com

Распространяется с газетой "Газета Слонимская" по подписке и в розницу по Республике Беларусь